*нов, В.П.* Указ. тв. – С. 366; РДГА. – Фонд 1263. – Воп. 1. – Спр. 159. – Л. 17.
29. НГАБ. – Фонд 1288. – Воп. 10. – Спр. 25. – Ч. 1. – Л. 2–14; Спр. 3288. – Л. 95–101.
30. НГАБ. – Фонд 2001. – Воп. 1. – Спр. 159. – Л. 17.
31. НГАБ. – Фонд 2001. – Воп. 1. – Спр. 159. – Л. 25.
32. НГАБ. – Фонд 1430. – Воп. 1. – Спр. 3288. – Л. 501 адв.
33. НГАБ. – Фонд 149. – Воп. 3. – Спр. 18. – Л. 1, 7–8.
34. ДГАЛ. – Фонд 378. – Воп. 48. – Спр. 196. – Л. 21–22.
35. ДГАЛ. – Фонд 378. – Воп. 48. – Спр. 196. – Л. 17.
36. НГАБ. – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 94. – Л. 133.
37. *Корева, А.* Материалы для географии и статистики России: Виленская губерния / А. Корева. – СПб.: Типография Иосафата Огризко, 1861. – 817 с.; *Бобровский, П.* Материалы для географии и статистики России: Гродненская губерния / П. Бобровский. – СПб.: В типографии генерального штаба, 1863. – 268 с.; *Зеленский, И.* Материалы для географии и статистики России: Минская губерния / И. Зеленский – СПб.: Военная типография, 1864. – 673 с.
38. НГАБ. – Фонд 142. – Воп. 1. – Спр. 659. – Л. 2.
39. ПСЗ. – Т. 22. – Ст. 358.
40. ПСЗ. – Т. 2. – Ст. 43183; Т. 24. – Ст. 17788.
41. НГАБ. – Фонд 2780. – Воп. 1. – Спр. 1. – Л. 4.
42. НГАБ. – Фонд 2780. – Воп. 1. – Спр. 1. – Л. 6.
43. НГАБ. – Фонд 2780. – Воп. 1. – Спр. 1. – Л. 1.
44. НГАБ. – Фонд 149. – Воп. 2. – Спр. 71. – Л. 11.

SUMMARY

*The article by Liutaya A. deals with the history of Belarusian cities and towns in the second half of the 18th – the first half of the 19th centuries. The growth of urban places and urban population and also the sources of this growth are analyzed. The author of the article pays her special attention to the evolution of a feudal town into a capitalist urban settlement. The process of genesis of capitalism in the economy of the cities and their social life is searched in the article as well.*

Паступіў у рэдакцыю 21.02.2012 г.

*УДК 902.2(476)(1–21)*

**Ю.У. Врублеўскі,**
*аспірант кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ*

# АРХЕАЛАГІЧНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ ТЭРЫТАРЫЯЛЬНАЙ СТРУКТУРЫ СТАРАЖЫТНЫХ ГАРАДОЎ УСХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ І БЕЛАРУСКАГА ПАНЯМОННЯ

Развіццё навуковых ведаў у галіне археалагічнага вывучэння старажытных гарадоў Беларусі набыло своеасаблівыя рысы ў гістарычнай навуцы. Уплываючы на стан і распрацоўку праблемных кірункаў айчыннай гістарыяграфіі, археалагічныя даследаванні гарадоў адлюстроўвалі патэнцыяльныя магчымасці навукі ў развіцці існуючых уяўленняў. Даволі значна дадзеныя працэсы актывізаваліся ў пасляваенныя гады. Археалагічнае вывучэнне Полацка, Віцебска, Мінска, Турава і іншых гарадоў адлюстроўвала спецыфіку фарміравання і развіцця не толькі асобных поглядаў навукоўцаў, але і тэарэтычных падмуркаў навукі. Агульная карціна дадзенай праблемы больш поўна прасочваецца на прыкладзе археалагічных даследаванняў гарадоў Усходняй Беларусі і Панямоння. У артыкуле ўвага аўтара будзе засяроджана ў асноўным на выніках археалагічнага вывучэння пасожскіх, падняпроўскіх (Магілёў, Рэчыца) і панямонскіх гарадоў Беларусі. Адпаведна, *мэта артыкула* – вызначэнне асаблівасцей развіцця навуковых ведаў у галіне гістарычнай тапаграфіі гарадоў Усходняй Беларусі і Панямоння.

Адным з першых гарадоў Пасожжа, які пачаў прыцягваць увагу археолагаў, стаў *Крычаў*. Навуковы характар археалагічнае вывучэнне Крычава набыло ў 1936 г. у выніку экспедыцыі па Сожы. Абапіраючыся на рэчавы матэрыял, які знаходзіўся ў верхніх гарызонтах культурнага слоя Гарадца, А.Д. Каваленя падкрэсліваў магчымасць існавання Крычава ў ранні час [1]. Абследаванні помнікаў горада ўзнавіліся ў 50–60-я гг. XX ст. невялікімі работамі В.В. Сядова, Г.В. Штыхава, П.Ф. Лысенкі. Да пачатку 70-х гг. XX ст. археалагічныя работы на тэрыторыі Крычава насілі бессістэмны характар.

Адным з першых праблему месцазнаходжання гістарычнага цэнтра Крычава імкнуўся вырашыць Г.В. Штыхаў. Ролю першапачатковага цэнтра горада, на погляд гісторыка, выконвала гарадзішча Гарадзец [2, с. 53]. Асноўны аб'ём даследчых работ на тэрыторыі Крычава выкананы М.А. Ткачовым (1973–1975 гг.) і А.А. Мяцельскім (1987–1988, 1995–2000 гг.). М.А. Ткачоў падтрымаў думку Г.В. Штыхава аб «пераносе» першапачатковага цэнтра Крычава на новае месца. Пры гэтым ён зазначаў, што жыццё на Гарадцы і селішчы не перапынялася пасля «перанясення» [3]. Па меркаванні А.А. Мяцельскага, жыццядзейнасць на Гарадцы, якая спынілася ў апошняй чвэрці I тыс. н. э., была ўзноўлена тут у канцы XI ст. [4, с. 9–26]. Паходжанне Крычава А.А. Мяцельскі звязвае з паселішчам, якое ўзнікла ў пойме Сожа на дзюне [5, с. 66–67].

Асноўная ўвага навукоўцаў у даследаванні Замкавай гары надавалася вывучэнню яе абарончых умацаванняў. М.А. Ткачоў ажыццявіў прарэзку вала ў заходняй частцы Замкавай гары і высветліў, што ён быў узведзены пасля яе засялення ў XII ст. [6, с. 383]. Па меркаванні А.А. Мяцельскага, першыя фартыфікацыйныя мерапрыемствы на Замкавай гары пачаліся ў канцы XII – пачатку XIII ст. [4, с. 33].

РЕПОЗИТОРИЙ ВГПУ

У выніку археалагічных работ 1976 г. на Спаскай гары М.А. Ткачовым былі выяўлены сляды гарадскога пасада, які размяшчаўся на паўднёвым усходзе ад Замчышча [7, с. 417–418]. А.А. Мяцельскі зазначае, што ў ніжэйшых напластаваннях культурнага слоя пасада знаходзяцца матэрыялы XII–XIII стст. [4, с. 81].

Археалагічныя помнікі *Мсціслава* пачалі вывучацца яшчэ ў дарэвалюцыйныя часы. Найбольш значныя археалагічныя даследаванні аб'ектаў Мсціслава праводзіліся ў пасляваенныя гады. Так, раскопкамі Мсціслава ў 1956–1985 гг. займаўся Л.В. Аляксееў. Узнікненне горада ў сярэдзіне XII ст. навуковец звязваў з будаўніцтвам крэпасці смаленскім князем Расціславам. Пры гэтым даследчыкам зазначалася, што перадмацерыковы слой Замкавай гары ўтрымліваў матэрыялы XII ст. [8, с. 75].

Нараўне з вывучэннем дзядзінца Мсціслава ў 1981–1987 гг. пачалі праводзіцца даследаванні (пад кіраўніцтвам А.А. Трусава) тэрыторыі вакольнага горада, вынікам якіх стала адкрыццё тут пасадскага месца [9]. На погляд Л.В. Аляксеева, вакольны горад Мсціслава быў узведзены паміж 1127 і 1159 гг. [10]. Абапіраючыся на вынікі раскопак, А.А. Трусаў і А.А. Мяцельскі прыйшлі да высновы, што мсціслаўскі пасад сфарміраваўся на аснове паселішча X–XI стст. Тым самым навукоўцы ўдакладнілі палажэнне Л.В. Аляксеева аб узнікненні Мсціслава. У 2008 г. археалагічныя работы на тэрыторыі пасада праводзіў А.А. Мяцельскі. Агульная плошча Мсціслава ў XII–XIII стст., па падліках гісторыка, складала 12–15 га [5].

Важнай гістарычнай падзеяй у айчыннай навуцы стала адкрыццё і даследаванне раннефеадальнага пасялення *Гомеля*. Навуковыя распрацоўкі на тэрыторыі горада пачаліся ў 1926 г. падчас якіх І.Х. Юшчанка заклаў шурфы і выявіў сляды керамічнага посуду X–XII стст. [11]. Абследаванні помніка ў розныя часы праводзілі А.М. Ляўданскі і Л.Д. Побаль. Пасля 1926 г. археалагічнае вывучэнне аб'ектаў Гомеля доўгі час не праводзілася.

Даследаванні Гомеля былі ўзноўлены толькі ў 1975 г., калі раскопкамі М.А. Ткачова былі закрануты дзядзінец і пасад горада. Навукоўцам высветлена, што штучныя ўмацаванні дзядзінца былі ўзведзены не раней за XII ст. Даследчык паставіў пад сумненне магчымасць існавання тут паселішча X ст. [12, с. 11]. Заслугай М.А. Ткачова стала адкрыццё ім пасадскай тэрыторыі Гомеля, якая, на погляд гісторыка, пачала фарміравацца ў XI ст. і займала плошчу больш за 2 га [12, с. 14].

З 1986 г. праблемамі ранняй гісторыі Гомеля займаецца А.А. Макушнікаў, які засяродзіў значную ўвагу на вывучэнні яго абарончых умацаванняў. Адкрыццё гісторыкам у 1987 г. двух умацаваных равоў дазволіла яму звязаць дадзеную акалічнасць з фарміраваннем у X ст. двухчасткавай структуры горада [13, с. 59]. На аснове раскопак 1988 г. даследчык зазначыў магчымасць існавання драўляных канструкцый вала гарадзішча. Па падліках навукоўца, памеры вакольнага горада Гомеля складалі больш за 10 га [13, с. 69]. Для выяўлення рэштак умацаванняў вакольнага горада спатрэбяцца дадатковыя пошукавыя работы. Вынікам шматгадовых археалагічных работ А.А. Макушнікава ў Гомелі стала вызначэнне ім тэрыторыі размяшчэння пасада горада. Заслуга навукоўца заключаецца ў тым, што ён змог даказаць меркаванне аб развітым характары тапаграфічнай структуры Гомеля.

Важныя навуковыя звесткі, якія былі атрыманы навукоўцамі падчас раскопак *Чачэрска*, датычыліся яго гістарычнай тапаграфіі. Невялікія раскопкі А.М. Ляўданскага, А.Д. Каваленя і С.А. Дубінскага на гарадзішчы Чачэрска ў 1928 г. паслужылі пачаткам археалагічнага вывучэння горада. Доўгі час тапаграфічныя аб'екты Чачэрска не былі мэтай навуковага даследавання. Сістэмны і планамерны характар вывучэнне Чачэрска набыло ў 70–80-я гг. XX ст. Так, у 1974–1975 гг. даследаваннем Чачэрска займаўся М.А. Ткачоў, які звярнуў увагу на існаванне землянога абарончага вала гарадзішча ў X ст. і існаванне ў XI ст. пасада Чачэрска. Цікавай уяўляецца думка А.А. Мяцельскага, што асновай гандлёва-рамеснага пасада Чачэрска паслужыла селішча [14, с. 65].

Археалагічнае вывучэнне *Прупоя* не надта багатае і пачалося толькі ў 1936 г. (А.М. Ляўданскі, А.Д. Каваленя, С.А. Дубінскі). Раскопкі Г.В. Штыхава 1967 г. на гарадзішчы Замкавая гара рэанімавалі даследаванне Прупоя і паказалі неабходнасць правядзення новых разведвальных работ. Шурфы, закладзеныя навукоўцам, паказалі, што ў ніжэйшых напластаваннях гарадзішча ўтрымліваюцца матэрыялы X – першай паловы XI ст. [2, с. 49]. Тым самым археалагічныя работы Г.В. Штыхава даказалі існаванне Прупоя ў XI ст.

У выніку даследаванняў М.А. Ткачова ў 1974 г. і А.А. Мяцельскага ў 1988 г. атрыманы новыя даныя аб ранняй гісторыі горада. У 1976 г. М.А. Ткачоў сфармуляваў тэзіс аб фарміраванні пасада Прупоя ў XII ст. А.А. Мяцельскі ў сваю чаргу звярнуў увагу на факт канцэнтрацыі курганных могільнікаў, што дало яму падставу сцвярджаць аб выкананні пасяленнем ролі адміністрацыйнага цэнтра валасці, а значыць, палічыць яго невялікім горадам [15, с. 63].

Археалагічныя работы ў *Магілёве* пачалі праводзіцца ў XIX ст., але ў асноўным яны абмяжоўваліся апісаннем і абследаваннем археалагічных помнікаў. Вывучэннем Магілёва ў розныя часы займаліся А.М. Ляўданскі, В.Р. Тарасенка (1928 і 1930 гг.), Ю.У. Кухарэнка (1951 г.), Л.Д. Побаль (1968 г.), Я.Р. Рыер (1973). У 1969–1972 гг. студэнт І.Г. Іонэ ў межах Магілёва і яго

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гістарычнага цэнтра здзейсніў разведвальныя раскопкі. На аснове аналізу знаходак І.Г. Іонэ вылучыў гіпотэзу аб існаванні старажытнарускага пасялення XI–XII стст. на месцы Магілёва [16, с. 70–72].

Непасрэднае археалагічнае даследаванне гістарычнага цэнтра Магілёва пачалося ў 1979–1981 гг., калі А.А. Трусаў, І.М. Чарняўскі і В.Р. Кукуня вывучалі архітэктурныя помнікі Магілёва. Першыя раскопкі Магілёўскага замка правёў М.А. Ткачоў у 1983 г. Доўгія часы ў гістарычнай навуцы дамінаваў погляд М.А. Ткачова, у адпаведнасці з якім вытокі горада арганічна былі звязаны з замкам (Замчышчам), які быў узведзены ў 1526 г. на гары «Магіла».

Важнай падзеяй у гісторыі археалагічнага вывучэння Магілёва сталі даследаванні І.А. Марзалюка (1992, 1993, 2006 гг.), які выявіў культурныя напластаванні XII–XIII стст. на тэрыторыі Магілёўскага замчышча. Тым самым стала магчымым сцвярджаць аб знаходжанні тут гарадзішча, якое з'яўлялася дзядзінцам горада. Знаходжанне селішчаў-перадграддзяў у значнай аддегласці ад гарадзішча Магілёва прывяло І.А. Марзалюка да думкі, што старажытны Магілёў меў разгрупаваную планіровачную структуру [17, с. 25]. Новыя даныя з гісторыі Магілёва былі атрыманы І.А. Марзалюком падчас археалагічнага даследавання ім тэрыторыі магілёўскага Замчышча ў 2006 г. Навукоўцам устаноўлена, што першыя ўмацаванні паселішча Магілёва былі ўзведзены ў канцы X–XI ст. Асаблівы інтарэс выклікае сцвярджэнне навукоўца аб наяўнасці ў горадзе мураванай царквы XII ст. [18, с. 254].

Археалагічнае вывучэнне *Рэчыцы* было распачата ў 1957 г. невялікімі раскопкамі расійскага археолага Э.А. Сымановіча. У 1976 г. даследаваннем гарадзішча Рэчыцы займаўся Г.В. Штыхаў, які выявіў культурны пласт помніка з керамікай XII–XIII стст. [19, с. 12]

Даследаванні А.А. Макушнікава ў 1989–1990 гг. на тэрыторыі вакольнага горада дазволілі вызначыць час яго засялення, асаблівасці вулічна-сядзібнай планіроўкі і сфармуляваць важную выснову аб тым, што Рэчыца сярэдзіны XII ст. уяўляла сабой звычайны феадальны горад [13, с. 55]. На погляд даследчыка, XII ст. стала часам, калі акрамя дзядзінца і вакольнага горада пачаў вылучацца і адкрыты пасад.

Фрагментарны характар насіла вывучэнне *Брагіна*. Абследаваннем рэшткаў Брагіна ў розныя гады займаліся Э.М. Загарульскі і П.Ф. Лысенка. У 1977 г. Днепра-Дзвінскім атрадам былі праведзены пошукавыя даследаванні з мэтай высвятлення месцазнаходжання дзядзінца Брагіна [3]. Эпізадычны характар яго вывучэння звязаны з нязначнымі раскопкамі М.А. Ткачова, якія ўсё ж дазволілі атрымаць пэўныя даныя аб планіроўцы горада. Сляды пасада Брагіна, адкрытага на ўсходзе ад гарадзішча, характар матэрыяльнай культуры помніка ўказваюць на існаванне ў XI–XIII стст. невялікага памежнага гарадскога пасялення, якое прыкрывала межы Кіеўскай зямлі.

Для параўнання асаблівасцей працэсу накаплення поглядаў гісторыкаў па праблеме гістарычнай тапаграфіі гарадоў Беларусі і выяўлення новых гістарыяграфічных ведаў неабходна звярнуцца да гісторыі археалагічнага вывучэння гістарычнай тапаграфіі гарадоў Панямоння.

Археалагічныя работы на тэрыторыі гістарычнага цэнтра *Гродна* (Старога замка) пачаліся ў 1931 г. Кіраўніцтва раскопкамі было даручана дырэктару Гродзенскага музея, польскаму гісторыку Я. Ядкоўскаму. На археалагічным матэрыяле навуковец паказаў, што летапіснае Гродна было заснавана на месцы больш старажытнага пасялення [20]. Археалагічнае вывучэнне Старога замка ў 1937–1938 гг. праводзіў З. Дурчэўскі. Нараўне з пытаннямі стратыграфіі і храналогіі дзядзінца Гродна гісторыкам была ўзнята праблема ўзнікнення горада і асаблівасці яго абаронча-архітэктурнай кампазіцыі. У гісторыі існавання старажытнага Гродна даследчык вылучыў два перыяды: рускі і літоўскі [21, s. 10].

Даследаванні Гродна, якія занялі важнае месца ў польскай гістарычнай навуцы, перапынілі ваенныя дзеянні. У пасляваенны перыяд вывучэннем Гродна пачалі цікавіцца савецкія гісторыкі. Так, М.М. Варонін сканцэнтраваў увагу на праблеме тапаграфічных помнікаў Старога замка. Асвятляючы гістарычную тапаграфію Гродна, гісторык рэканструяваў тэрыторыю размяшчэння пасада і выказаў думку аб магчымасці размяшчэння некропаля Гродна ў XII–XIII стст. за р. Нёман [22, с. 17]. Дзякуючы раскопкам М.М. Вароніна было канчаткова высветлена, што ўзвядзенню крэпасці Гродна папярэднічала старажытнае пасяленне.

Праблему складвання дзядзінца Гродна ў сваіх працах разглядалі М.А. Ткачоў, Я.Г. Звяруга, П.А. Рапапорт, А.А. Трусаў. Рэшткі драўляных умацаванняў Старога замка ў 1971 г. даследавалі М.А. Ткачоў і Я.Г. Звяруга. П.А. Рапапортам і А.А. Трусавым высветлена, што ў 90-я гг. XII ст. згарэлая частка драўлянага дзядзінца была ўмацавана цаглянымі абарончымі мурамі [23, с. 20–21]. Немагчыма пагадзіцца з думкай А.А. Трусава, В.Е. Собаля і Н.І. Здановіча, якія сцвярджалі, што комплекс пабудоў, якія ўтварылі дзядзінец Гродна, сфарміраваўся ў канцы X – пачатку XI ст. [23, с. 18].

Археалагічныя работы, што ахапілі тэрыторыю Старога замка, былі распаўсюджаны і на іншыя часткі гістарычнага цэнтра Гродна. Так, вывучэннем Каложскага плато ў 1971–1973 гг. займаўся Я.Г. Звяруга. На падставе аналізу рэчавых матэрыялаў і керамікі, Я.Г. Звяруга вызначыў, што засяленне вывучаемай тэрыторыі адбывалася ў XII ст., калі пачало складвацца гандлёва-рамеснае пасяленне [24]. Дадатковыя звесткі пра размяшчэнне пасада Гродна былі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

атрыманы І.М. Чарняўскім, які ў 1980–1981 гг. праводзіў вывучэнне Прачысценскай царквы і натрапіў на матэрыялы XI–XII стст. На думку гісторыка, прылеглая тэрыторыя падворка базыльянак пачала засяляцца ў XI ст. [25, с. 119].

На тэрыторыі Новага замка ў 1986–1988 гг. А.К. Краўцэвічам праводзілася вывучэнне вакольнага горада Гродна. У перадмацерыковым слоі даследчыкам былі зафіксаваны знаходкі плінфы, фрагменты маёлікавай пліткі і галасніка. Раскоп, закладзены гісторыкам у паўднёва-заходняй частцы Новага замка, дазволіў засведчыць у перадмацерыковым слоі наяўнасць керамікі XII–XIII стст. [26, с. 44].

Не менш істотнай з'явай стала адкрыццё новых матэрыялаў з гісторыі зараджэння другога панямонскага горада – *Навагрудка*. Умацаваны цэнтр Навагрудка вывучаўся ў 1956, 1959, 1962 гг. і сістэматычна пачаў даследавацца з 1968 г. Думку аб узвядзенні ўмацаванняў навагрудскага дзядзінца ў канцы X ст. упершыню выказаў П.А. Рапапорт [27, с. 90]. На погляд М.А. Ткачова, гісторыя фартыфікацыйнага будаўніцтва пачынаецца з XI ст. Ф.Д. Гурэвіч зазначала, што культурны слой, які ўтрымліваўся пад насыпам вала, датуецца канцом X – пачаткам XI ст. Афармленне дзядзінца Навагрудка было аднесена Ф.Д. Гурэвіч да сярэдзіны – першых дзесяцігоддзяў другой паловы XI ст. [28]. Характарызуючы асаблівасці фартыфікацыйнай сістэмы, навукоўца звярнула ўвагу, што ў сярэдзіне XII ст. адбылося «перамяшчэнне» вала Замкавай гары ў паўночным кірунку, а ў пачатку XIII ст. быў узведзены дадатковы вал [28, с. 98–99].

Археалагічныя даследаванні 1957–1967 гг., якія ахапілі розныя часткі Малога замка Навагрудка, былі абагульнены ў працы Ф.Д. Гурэвіч [29]. Тэзіс Ф.Д. Гурэвіч аб часе ўзнікнення ранняга пасялення Малога замка быў пацверджаны матэрыяламі ніжэйшых напластаванняў культурнага слоя з раскопак М.В. Малеўскай. Высветлілася, што першапачатковая стадыя функцыянавання пасялення магла быць звязана не толькі з канцом X ст., а нават і з другой паловай X ст. [30, с. 92]. Ф.Д. Гурэвіч выказала думку, што ўзвядзенне абарончых умацаванняў Малога замка адбылося ў другой палове XII ст. Праблема фартыфікацый вакольнага горада Навагрудка разглядалася ў працах П.А. Рапапорта і М.А. Ткачова.

Археалагічныя работы, якія праводзіліся ў іншых частках горада, дазволілі А.К. Краўцэвічу, А.А. Трусаву і В.Е. Собалю прасачыць зоны распаўсюджвання пасадскай тэрыторыі Навагрудка.

Менш інтэнсіўным аказалася вывучэнне помнікаў Слоніма, Турыйска і Здзітава. Што датычыцца археалагічных даследаванняў *Ваўкавыска*, то ў яго вывучэнні прымалі ўдзел некалькі гістарыяграфічных школ. Упершыню праблема ўзнікнення Ваўкавыска была ўзнята ў польскай гістарыяграфіі. Так, у 1925 г. Я. Ядкоўскім даследаваліся Шведская гара і Замчышча Ваўкавыска. Новы этап археалагічнага вывучэння Ваўкавыска звязваецца з дзейнасцю расійскіх і беларускіх гісторыкаў у пасляваенныя гады. Старажытнасці Ваўкавыска ў 1948 г. даследаваў Г.І. Пех. Вывучэннем абарончых умацаванняў Ваўкавыска ў 1959 г. займаўся П.А. Рапапорт. Суцэльнае ўяўленне аб ранняй тапаграфіі горада сфармуляваў В.Р. Тарасенка, які ў 1954–1956 гг. праводзіў яго археалагічныя даследаванні. Даследчык прыйшоў да высновы, што ўзнікненне дзядзінца Ваўкавыска не выходзіла за межы канца XI – пачатку XII ст. [31, с. 26]. В.Р. Тарасенка меркаваў, што пасад горада размяшчаўся ў падножжа Шведскай гары і прылягаў да яе з паўночнага, усходняга і паўднёвага бакоў [32, с. 279]. Найбольш поўную характарыстыку гістарычнай тапаграфіі Ваўкавыска прапанаваў Я.Г. Звяруга. Па меркаванні гісторыка, Шведская гара была заснавана ў сярэдзіне X ст., Мураве́льнік і Замчышча на мяжы X–XI стст. [33, с. 20]. Тапаграфія горада, па погляд даследчыка, канчаткова сфарміравалася ў сярэдзіне XII ст. і ўключала ў сябе дзядзінец (Шведская гара), вакольны горад (Замчышча), неўмацаваныя пасяленні.

Такім чынам, аналіз прац па праблеме гістарычнай тапаграфіі старажытнарускіх гарадоў Усходняй Беларусі дазволіў прасачыць уплыў асабістага вопыту даследчыка ў вывучэнні горада на фарміраванне яго ўяўленняў. Так, мэтазгодна адзначыць, што асноўны змест і вынікі даследаванняў І.А. Марзалюка (у Магілёве), А.А. Макушнікава (у Гомелі), А.А. Мяцельскага (у Крычаве) адлюстроўвалі ў іх навуковых пабудовах цэласную карціну ўзнікнення і развіцця гарадскога пасялення, уключаючы ў яе археалагічныя матэрыялы (факталагічны базіс) з розных структурных частак горада. Вынікі археалагічных работ І.А. Марзалюка дазволілі яму па-новаму паглядзець на генезіс Магілёва. Дзякуючы шырокаму ахопу раскопачнымі работамі тэрыторыі старажытнага Гомеля А.А. Макушнікаў даказаў думку аб фарміраванні складанай тапаграфічнай структуры Гомеля падчас яго ўзнікнення. Улічваючы высновы Г.В. Штыхава і М.А. Ткачова, пашыраючы іх новымі данымі, А.А. Мяцельскі раскрыў працэс цэласнага зараджэння і развіцця тапаграфічнай прасторы старажытнага Крычава. Вывады М.А. Ткачова, А.А. Макушнікава, А.А. Мяцельскага аб складванні Чачэрска і Прупоя, якія датычыліся іх сацыяльнай сутнасці, былі сфармуляваны навукоўцамі на аснове абмежаваных памераў раскопаў і таму патрабуюць свайго ўдакладнення і прыцягнення новых даных для іх доказнасці. Свайго пацвярджэння чакае думка аб існаванні пасада Рэчыцы ў XII ст.

Польскія даследаванні 1925, 1931–1932, 1937–1939 гг. ініцыявалі археалагічнае вывучэнне Ваўкавыска і Гродна і паўплывалі на

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

далейшыя гістарыяграфічныя традыцыі новых школ. Археалагічныя раскопкі польскіх гісторыкаў дапамаглі распрацаваць альтэрнатыўныя версіі аб узнікненні Гродна савецкімі і постсавецкімі навукоўцамі. Ацэньваючы стан археалагічнага вывучэння Навагрудка, можна адзначыць, што найбольш значнай з'явай сталі работы Ф.Д. Гурэвіч, якія дазволілі ёй вызначыць спецыфіку станаўлення горада ў сувязі яго ўтваральных пасяленняў. Значная роля ў вывучэнні пытанняў гістарычнай тапаграфіі панямонскіх гарадоў Беларусі (Ваўкавыск, Слонім, Гродна) належала Я.Г. Звяругу, які адзін з першых узняў праблему выяўлення гарадскіх арганізмаў унутры асобнага рэгіёна. Нараўне са значнымі гістарыяграфічнымі традыцыямі археалагічных даследаванняў Гродна, Навагрудка і Ваўкавыска для гістарычнай навукі Беларусі характэрнай была адсутнасць устойлівых уяўленняў па праблеме ўзнікнення Турыйска і Здзітава, што было выклікана нізкай інтэнсіўнасцю іх археалагічнага вывучэння.


*Літаратура і крыніцы*

1. *Коваленя, А.Д.* Дневник за 1936 г. / А.Д. Коваленя // Архіў ІГНАНБ. – Спр. № 457.
2. *Штыхов, Г.В.* Отчет об археологических исследованиях в Северной Белоруссии в 1967 г. / Г.В. Штыхов // Архіў ІГНАНБ. – Спр. № 349.
3. *Ткачоў, М.А.* Справаздача аб палявых даследаваннях за 1977 г. Днепра-Дзвінскага атрада Беларускай археалагічнай экспедыцыі / М.А. Ткачоў // Архіў ІГНАНБ. – Спр. № 760.
4. *Мяцельскі, А.А.* Старадаўні Крычаў: Гіст.-археал. нарыс горада ад старажыт. часоў да канца XVIII ст. / А.А. Мяцельскі. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – 165 с.
5. *Мяцельскі, А. А.* Мсціслаўскае княства і ваяводства ў XII–XVIII стст. / А.А. Мяцельскі. – Мінск: Бел. навука, 2010. – 663 с.
6. *Ткачев, М.А.* Работы отряда по изучению военного зодчества Белоруссии / М.А. Ткачев // Археологические открытия 1973 г. / РАН Ин-т археологии; редкол. Б.А. Рыбаков (отв. ред.). – М., 1974. – С. 382–383.
7. *Ткачев, М.А.* Работы Посожского отряда / М.А. Ткачев // Археологические открытия 1976 г. / РАН Ин-т археологии; редкол. Б.А. Рыбаков (отв. ред.). – М., 1977. – С. 417–418.
8. *Алексеев, Л.В.* Мстиславский детинец в XII–XIV вв. / Л.В. Алексеев // Российская археология. – 1995. – № 3. – С. 60–76.
9. *Трусаў, А.А.* Некаторыя вынікі археалагічнага вывучэння вакольнага горада Мсціслава XII–XVII стст. / А.А. Трусаў, М.А. Ткачоў, А.А. Мяцельскі // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1990. – № 2. – С. 80–88.
10. *Алексеев, Л.В.* Смоленская земля в IX–XIII вв. Очерки истории Смоленщины и Восточной Белоруссии / Л.В. Алексеев. – М.: Наука, 1980. – 261 с.
11. *Юшчанка, І.Х.* Археолёгічныя досьледы ў Гомельскай акрузе / І.Х. Юшчанка // Запіскі аддзела гуманітарных навук. – Кн. 2: Працы археолёгічнай камісіі. – 1930. – Т. 2. – С. 513–515.
12. *Ткачёв, М.А.* Справаздача аб археалагічных даследаваннях за 1975 год Пасожскага атрада / М.А. Ткачоў // Архіў ІГНАНБ. – Спр. № 514.
13. *Макушников, О. А.* Гомельское Поднепровье в V – середине XIII вв.: социально-экономическое и этнокультурное развитие / О. А. Макушников. – Гомель: ГГУ, 2009. – 216 с.
14. *Метельский, А.А.* Города белорусского Посожья в X – XIII вв.: дис. … канд. ист. наук: 07.00.06 / А.А. Метельский. – Минск, 1992. – 306 с.
15. *Мяцельскі, А.А.* Старажытны Прупой / А.А. Мяцельскі, М.А. Ткачоў // Магілёўская даўніна: зб. арт. – Магілёў, 1997. – С. 61–66.
16. *Ионе, И.Г.* К вопросу о первоначальной дате г. Могилева (по материалам археологических разведок) / И.Г. Ионе // Материалы пятой региональной археологической студенческой конференции вузов Северо-Запада и центральных областей СССР; редкол. Г.И. Волчок (гл. ред.) [и др.]. – Могилев, 1975. – С. 70–72.
17. *Марзалюк, І.А.* Магілёў у XII – XVIII стагоддзях. Людзі і рэчы / навук. рэд. Я.Р. Рыер. – Магілёў; Мінск: Веды, 1998. – 260 с.
18. *Марзалюк, І.А.* Вынікі археалагічных даследаванняў у гістарычным цэнтры і ваколіцах Магілёва / І.А. Марзалюк // Гістарычна-археалагічны зборнік. – 2007. – Вып. 23. – С. 254–255.
19. *Штыхов, Г.В.* Отчет о раскопках в Минске, на Менке, и обследованиях в Речицком оайлне Гомельской области в 1976 г. / Г.В. Штыхов, В.Е. Соболь // Архіў ІГНАНБ. – Спр. № 546.
20. *Jodkowski, J.* Grodno wczesnosredniowieczne w swiatle prac wykopaliskowych, dokonanych na Krolewskim Zamku Starym w Grodnie w latach 1932 i 1933 / J. Jodkowski // Przeglad historyczno-wojskowy. – 1934. – T. 1. – S. 1–17.
21. *Durczewskij, Z.* Stary Zamek w Grodnie w swietle wykopalisk dokonanych w latach 1937 – 1938 / Z. Durczewskij // Nieman. – 1939. – № 1.
22. *Воронин, Н.Н.* Древнее Гродно: По материалам археологических раскопок 1932–1949 гг. / Н.Н. Воронин. – М.: Изд-во АН СССР, 1954. – 239 с.
23. *Трусаў, А.А.* Стары замак у Гродне XI–XVIII стст.: Гісторыка-археалагічны нарыс / А.А. Трусаў, В.Е. Собаль, Н.І. Здановіч. – Міснк: Навука і тэхніка, 1993. – 152 с.
24. *Зверуго, Я.Г.* Археологические исследования в Гродно / Я.Г. Зверуго, М.А. Ткачев // Археологические открытия 1971 года / РАН Ин-т археологии; редкол. Б.А. Рыбаков (отв. ред.). – М., 1972. – С. 407–408.
25. *Чернявский, И.М.* Пречистенская церковь XII в. в Гродно / И.М. Чернявский // Древнерусское государство и славяне: материалы симпоз., посвящ. 1500-летию Киева / АН БССР, Ин-т истории, редкол. Л.Д. Поболь [и др.]. – Минск, 1983. – С. 119–121.
26. *Краўцэвіч, А.К.* Гарады і замкі Беларускага Панямоння XIV–XVIII стст.: Планіроўка, культурны слой / А.К. Краўцэвіч – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 171 с.
27. *Раппопорт, П.А.* Военное зодчество западнорусских земель X–XIV вв. / П.А. Раппопорт. – Л.: Наука, 1967. – 241 с.
28. *Гуревич, Ф.Д.* Некоторые итоги археологического исследования детинца древнего Новогрудка / Ф.Д. Гуревич // Краткие сообщения института археологии. – 1974. – Вып. 139. – С. 93–99.
29. *Гуревич, Ф.Д.* Древний Новогрудок: Посад – окольный город / Ф.Д. Гуревич. – Л.: Наука, 1981. – 159 с.
30. *Малевская, М.В.* О датировке нижнего горизонта Новогрудка / М.В. Малевская // Краткие сообщения института археологии. – 1965. – Вып. 104. – С. 85–92.
31. *Тарасенко, В.Р.* Дневник археологических раскопок на городище «Шведская гора» г. Волковыска 1954 г. / В.Р. Тарасенко // Архіў ІГНАНБ. – Спр. № 13057.
32. *Тарасенко, В.Р.* Раскопки городища «Шведская гора» в Волковыске в 1954 г. / В.Р. Тарасенко // Материалы по археологии БССР. Т. 1. – Минск, 1957. – С. 258–279.
33. *Зверуго, Я.Г.* Древний Волковыск: X–XIV вв. / Я.Г. Зверуго. – Минск: Наука и техника, 1975. – 143 с.



*Summary*

*The article deals with the analyses of archaeological researches on the problem of historical topography of ancient cities in East Belarus and Belorussian Ponemanje. It is underlined that the researcher's experience in studying of city settlement exerts influence on formation of his scientific views. Also the article investigates the features of archaeologists' disclosing of scientific pictures of cities' folding and development according to the specificity topographic and planning settlement's structures. The author estimates the main achievements of domestic scientists, highlights the merit of FD Gurevich and focuses on issues that require further study.*


Паступіў у рэдакцыю 19.03.2012 г.

РЭПАЗІТОРЫЙ ВДПУ